# АПАНТАНАСЦЬ — ЯГО ЖЫЦЦЁ



Не памылюся, калі скажу, што Міхася Леанідавіча Цыбульскага, кандыдата мастацтвазнаўства, дацэнта, дацэнта кафедры выяўленчага мастацтва, сябра Беларускага саюза мастакоў, лаўрэата ганаровага звання «Чалавек года Віцебшчыны-2015» ведаюць не толькі ў Прыдзвінскім краі, але і далёка за межамі Рэспублікі Беларусь. Дзякуючы яму віцябчане знаёмяцца са шматлікімі творамі жывапісу, прыкладнога мастацтва і графікі. Міхась Цыбульскі заняты кожную хвіліну, часта працуе па начах да самага світанку, каб паспець падрыхтаваць матэрыял пра творцаў Віцебскай мастацкай школы, новую выставу або выязны пленэр для чарговай энцыклапедыі, кнігі ці рэспубліканскіх і мясцовых выданняў.

З вялікай самаадданасцю, ніколі не шкадуючы часу, мастацтвазнавец знаёміць незлічоную колькасць дэлегацый, камісій, розных афіцыйных асоб (перш за ўсё замежных) з гісторыяй і культурай Віцебшчыны.

Прамовы Міхася Цыбульскага на адкрыцці выстаў — гэта дакладнае адлюстраванне яго душы, дакладны адбітак яго сутнасці. У іх мы бачым мастака, заўзятага прыхільніка нацыянальных традыцый, мудрага настаўніка і непераўзыдзенага прамоўцу. Ён жыве не толькі лекцыямі, канферэнцыямі, творчымі сустрэчамі, але і паспявае звярнуцца да палатна, ад канкрэтных здарэнняў пераносіцца да іх жывога і пластычнага сімвала. Нездарма на яго выставы заўсёды прыходзіць шмат гасцей і наведвальнікаў.

Мастак-педагог умее перадаць студэнтам частку сваёй творчай энергіі і натхніць іх на новыя адкрыцці. Моладзь яго любіць, заўжды з ім раіцца, паважае яго як выдатнага мастака, добразычлівага і спагадлівага дарадцу, чалавека з неверагодным пачуццём гумару.

Зусім нядаўна, падчас святкавання 106-годдзя з дня заснавання нашай альма-матар, на цырымоніі ўручэння спецыяльнай прэміі «Docendo discimus» Міхась Леанідавіч атрымаў сімвалічную статуэтку і дыплом у намінацыі «За ўнёсак у развіццё мастацтва і культуры».

Наперадзе ў М.Л. Цыбульскага мноства творчых праектаў і выстаў, пленэраў і знаёмстваў з маладымі перспектыўнымі мастакамі, якім ён перадасць свае веды і вопыт.

**Фёдар ШКІРАНДА.**

ЮБІЛЯРЫ